ад слова *vita* — *„жыцьцё“*. Ідэя *„вітаізму“* апярэдзіла „маладнякізм“ — кірунак афіцыёзны, клясавы, з ідэалам усясьветнай камуны, хоць рэальная творчасьць таленавітых „маладнякоўцаў“ аказалася бліжэйшай да *„вітаізму“*.

Пазьней, у 1927–30-х гадох узвышэнцы — стваральнікі літаратурнага аб'яднаньня „Ўзвышша“, перш за ўсё Бабарэка й Дубоўка, у праграмных дакумэнтах, у артыкулах Бабарэкі *„Аквітызм* у творчасьці Ўладзімера Дубоўкі“, „Узвышэнская паэзія — аналіз паняцьця“, „Паэзія як уяўленьне“ абгрунтавалі *„аквітызм“* — новую плынь беларускае літаратуры, альтэрнатыву афіцыёзнаму „сацыялістычнаму рэалізму“.

*Аквітызм* уяўляўся ўзвышэнцам як сынтэз нацыянальнае традыцыі й новаэўрапейскага мастацкага наватарства.

У паэме „І пурпуровых ветразей узьвівы“ Ўладзімер Дубоўка, карыстаючыся скарочаным беларускім варыянтам гэтага паняцьця, пісаў:

А дух трымаем на галоднай норме,
а дух скарынкай эпігоннай сыты.
Яго суседзі, мабыць, не накормяць,
затым патрэбна духу *акавіта*.

Вось такі кірунак у нашай літаратуры пачаўся, але не адбыўся, не зрэалізаваўся да канца ў зьвязку зь ліквідацыяй „Узвышша“ й ліквідацыяй узвышэнства ў беларускай літаратуры наагул у эпоху бальшавіцкае дыктатуры.

# Акцябронак

***Рыгор Барадулін***

*Акцябронак* — слова-адгалосак кастрычніцкага перавароту 1917 году. Сам пераварот дазвалялася перакладаць як „кастрычніцкая“ „вялікая“ рэвалюцыя, а вытворныя словы вымушалі бязглузда калькаваць. Адсюль — і *акцябронак*.

Шануючы мову, трэ было б, каб хоць „акцябраня“ ўжывалі. Яно й праўда, „кастрычыня“ нечым з „кастратам“ перагукаецца. Але бальшавікам закон быў ня пісаны. У іх і прыгожае мястэчка Рудабелка стала пасёлкам Акцябрскім.

Хто такія *акцябраты*? Гэта вучні малодшых клясаў, якія рыхталіся стаць *чырванагальштучнымі*, а пакуль насілі пяцікутную зорку з выяваю херувімчыка-Леніна ў маленстве.

*Акцябратаў* называлі ўнучанятамі Леніна, хоць сам правадыр сусьветных пралетароў ніколі дзяцей ня меў.

Дзіцячы часопіс, сёньняшняя „Бярозка“, называўся „Іскры Ільліча“. Хоць ізноў жа, форма Ільліч — не беларуская, і на слых чуецца — „і лыч“, „і лыча“. Але партыйнае, хай сабе і беларускае, вуха не магло і ў жахотным сьне пачуць такое.

*Акцябратаў* выхоўвалі ў прасавецкім духу, абагаўляючы Леніна. Неяк мая маленькая дачушка Ілона прыйшла са школы (а ў школах у *акцябраты* заганялі статкам), маці ёй падае есьці, яна — „Ня буду! Ленін нічога ня еў! Ён дзецям усё аддаваў! Так нам настаўніца казала“.

У Беларусі, як у запаведнай савецкай зоне, піянэрская арганізацыя захавалася да 2000 году.